ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
І.Г.Лашкевіч
19.03. 2024 г.

ЗАДАННІ
для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд
па вучэбным прадмеце "Чалавек і свет"

Дата правядзення: 27 сакавіка 2024 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 11.40 (45 хвілін, 10 хвілін перапынак, 45 хвілін).

## IV клас

**1. Выкарыстоўваючы словы для даведак, запоўніце пропускі ў тэксце. Запішыце адказы ў табліцу.**

(1) – гэта прыродныя багацці, якія здабываюцца з зямлі і выкарыстоўваюцца чалавекам. Самыя распаўсюджаныя карысныя выкапні – (2) і (3). Яны залягаюць вялікімі пластамі ў тоўшчы зямлі або на паверхні і здабываюцца па ўсёй тэрыторыі нашай краіны. Важнейшыя карысныя выкапні Беларусі – (4), (5), (6), (7), (8), (9). Месцы, дзе ў глыбіні або на паверхні Зямлі залягаюць карысныя выкапні, называюць (10).

З (11) атрымліваюць каштоўнае ўгнаенне для палёў і агародаў. Яно паляпшае ўрадлівасць глебы, павышае ўраджайнасць раслін. З (12), якая залягае ў зямлі, вырабляюць мыла, шкло, кераміку, некаторыя фарбы, лекі. (13) называюць чорным золатам. (14) і (15) – гаручыя карысныя выкапні. Пры іх згаранні вылучаецца цяпло, таму іх ужываюць як паліва.

**Словы для даведак:** радовішча, пясок, торф, карысныя выкапні, гліна, калійныя солі, нафта, каменная соль, пясок.

| № | Адказ | № | Адказ |
|---|---|---|---|
| 1 | | 9 | |
| 2 | | 10 | |
| 3 | | 11 | |
| 4 | | 12 | |
| 5 | | 13 | |
| 6 | | 14 | |
| 7 | | 15 | |
| 8 | | | |

**2. Пазначце на контурнай карце з дапамогай лічбаў у кружочках буйныя формы рэльефу Рэспублікі Беларусь:** 1 – Мінскае ўзвышша, 2 – Полацкая нізіна, 3 – Цэнтральнабярэзінская раўніна, 4 – Палеская нізіна, 5- Аршанска-Магілёўская раўніна.

**3. Пазначце на контурнай карце ў трохвугольніках водныя аб'екты Рэспублікі Беларусь:** Р1 – Прыпяць, Р2 – Бярэзіна, Р3 – Заходняя Дзвіна, Р4 – Нёман, О1 – Браслаўскія азёры.

**4. Падпішыце на контурнай карце важныя прыродныя аб'екты Рэспублікі Беларусь:**

вышэйшую кропку – гару Дзяржынскую;

самае вялікае па плошчы возера – Нарач;

самую доўгую раку – Днепр.



**5. Пазнайце расліны па характэрных для іх прыкметах. Адказ запішыце.**

| Расліны | Прыкметы |
|---|---|
| | Хвойны куст з даўкім смалістым пахам. Яго калючыя плоскія хваінкі растуць на галінках па тры. Шышкі з насеннем маюць выгляд сініх ягад. Чорна-сінія ягады – гэта не сапраўдныя плады-ягады, а шышкі, якія апрануты замест лускавінак мякаццю з тоўстай скуркай. |
| | Расліна з буйнымі брудна-жоўтымі кветкамі з фіялетавымі пражылкамі. Лісце шэра-зялёнае або цёмна-зялёнае, даўгаватае, з буйнымі зубчыкамі. Плады падобныя на гарлачыкі. Уся расліна пакрыта пушком ліпкіх валасінак. |
| | Лісце гэтай расліны даўгаватай формы размешчана на сцябле па 3-4 лісты. Кветкі гэтай расліны маюць разнастайную афарбоўку: жоўтую, чырвоную, фіялетавую, белую. Сваёй формай кветкі падобныя на чаравічак. Зацвітае яна на 15-ы год жыцця. |





**6. Падумайце і запішыце, як пазбегнуць атручэння ядавітымі раслінамі.**

**7. Працягніце сказ (падбярыце абагульняючыя словы). Адказ запішыце.**

Карані, сцябло, лісты, кветкі, плады – гэта ________________.

Белы грыб, лісічка, падасінавік, шампіньён, сыраежка – ____________.

Насякомыя, рыбы, птушкі, звяры, земнаводныя, паўзуны – гэта ______________.

Пчала, аса, чмель – гэта _________________________.

Поўнач, поўдзень, захад, усход – _________________________.

Лес, луг, балота, вадаём (рака, возера) – ___________________________.

**8. Пра каго ідзе гаворка? Вызначыце па апісанні. Адказы запішыце.**

| | |
|---|---|
| Ой, хто хоць адзін раз ступіў на свіцязянскі бераг, абавязкова вяртаецца сюды. Ён жадае зноў убачыць «зоркі над сабою і зоркі пад сабою, і месяцы два побач з імі...».<br>Гэтыя радкі напісаў славуты паэт, які нарадзіўся тут, на Навагрудчыне. Ён прысвяціў сваёй Радзіме і возеру Свіцязь нямала вершаў. Паэту ўстаноўлены помнікі ў Навагрудку і ў сталіцы нашай краіны. | ________________<br>________________<br>________________ |
| У пачатку 12 стагоддзя ў Тураве нарадзіўся хлопчык. Калі ён вырас, то стаў манахам. Ён пачаў пісаць павучанні пра тое, як павінны жыць людзі. Каб маліцца за людзей, ён добраахвотна зачыніўся ў высокай драўлянай вежы, збудаванай на беразе Прыпяці. Ён знаходзіўся ў роздуме, пісаў малітвы, што вядомыя і цяпер. Сучаснікі за красамоўства называлі яго Залатавустам. | ________________<br>________________<br>________________ |
| Стаўшы выдатным вучоным, ён вырашыў узяцца за друкаванне кніг на старабеларускай мове. На радзіме ўмоў для друкавання не было, і ён накіраваўся ў чэшскі горад Прагу. Тут у 1517 годзе выйшла ў свет першая друкаваная кніга, выдадзеная ім. Прыкладам уласнага жыцця ён паказаў, як трэба любіць свой народ і шанаваць матчыну мову.<br>Самыя славутыя людзі нашай краіны і замежжа ўзнагароджваюцца ордэнам, які названы яго іменем. | ________________<br>________________<br>________________ |
| Беларускі паэт прысвяціў адзін са сваіх вершаў слуцкім майстрам:<br>Цямнее край зубчаты бору...<br>І тчэ, забыўшыся, рука<br>Заміж персідскага ўзору<br>Цвяток радзімы васілька. | ________________<br>________________<br>________________ |
| На тэрыторыі Беларусі, захопленай ворагамі, разгарнулася сапраўдная народная вайна. У ёй удзельнічалі і дарослыя, і дзеці, і старыя. Аказваў дапамогу партызанам амаль 100-гадовы беларус. | ________________<br>________________<br>________________ |
| Першым Героем Беларусі стаў ваенны лётчык, падпалкоўнік. У час вучэбнага палёту ў яго самалёце ўзнік пажар. Лётчык атрымаў каманду пакінуць пашкоджаную машыну. Аднак ён вырашыў адвесці палаючы самалёт убок ад вёскі. Коштам уласнага жыцця ён выратаваў жыцці многіх людзей. | ________________<br>________________<br>________________ |




**9. Разгледзьце карту “Старажытныя землі Беларусі”. Запішыце галоўныя гарады старажытных княстваў.**

| Княства | Галоўны горад княства |
|---|---|
| Полацкае княства | |
| Навагрудскае княства | |
| Тураўскае княства | |

**10. Разгледзьце карту “Старажытныя землі Беларусі”. Размясціце на стужцы часу гарады Віцебск, Магілёў, Гомель, Полацк у залежнасці ад першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах.**



**Крытэрыі ацэнкі алімпіядных заданняў па вучэбным прадмеце “Чалавек і свет”**
**Максімальная колькасць балаў – 78**

| № п/п | Колькасць балаў |
|---|---|
| **1.** | **15 б.**<br>Па 1 б. за кожны правільны адказ. |
| **2.** | **10 б.**<br>Па 2 б. за кожны правільны адказ. |
| **3.** | **5 б.**<br>Па 1 б. за кожны правільны адказ. |
| **4.** | **6 б.**<br>Па 2 б. за кожны правільны адказ. |
| **5.** | **6 б.**<br>Па 2 б. за кожны правільны адказ. |
| **6.** | **10 б.** |
| **7.** | **6 б.**<br>Па 1 б. за кожны правільны адказ. |
| **8.** | **6 б.**<br>Па 1 б. за кожны правільны адказ. |
| **9.** | **6 б.**<br>Па 2 б. за кожны правільны адказ. |
| **10.** | **8 б.**<br>Па 2 б. за кожны правільны адказ. |